

В. А. Багуцкі.

**БАГУЦКІ** Вацлаў Антонавіч (парт. псеўд. Шпак, Аляксандр; 1884, мяст. Буракуў каля Варшавы — 19.12. 1937), рэвалюцыянер, сав. парт. дзеяч. У 1904 уступіў у СДКПіЛ. Дэлегат V з'езда (1906) СДКПіЛ ад арг-цый Беласточчыны. За рэв. дзейнасць 9 разоў арыштаваны, 4 гады знаходзіўся ў турмах. У 1910 эмігрыраваў у ЗША, там з польскіх рабочых стварыў секцыю СДКПіЛ. У 1912 вярнуўся ў Расію. Удзельнік 1-й сусв. вайны, вёў рэв. агітацыю сярод салдат. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 чл. выканкома Тыфліскага Савета, адзін з кіраўнікоў Тыфліскай парт. арг-цыі бальшавікоў. У 1918 кіраўнік к-та СДКПіЛ, стваральнік арг-цый Кампартыі Польшчы ў Беластоку і Гродне. Старшыня *Гродзенскага падпольнага камітэта РКП(б) 1918*, з 26.1 да 27.4.1919 — *Гродзенскага Савета рабочых дэпутатаў 1919*. У 1919—20 старшыня Надзвычайнай камісіі ў Мінску, чл. ЦК, адначасова чл. Бюро па нелегальнай рабоце пры ЦК КП(б)ЛіБ. У 1921 аднаўляў падп. парт. арг-цыі на тэр. Зах. Беларусі і Віленшчыны. Удзельнік II з'езда (1923) КПРП. У 1921—22 заг. аргаддзела, у 1922—24 сакратар *Цэнтральнага Бюро КП(б)Б* і нам. старшыні СНК БССР, чл. прэзідыума і нам. сакратара *Часовага Беларускага бюро ЦК РКП(б)*. У 1924—25 прадстаўнік ЦК Кампартыі Польшчы ў Выканкоме Камінтэрна і чл. ВККІ. Пасля вучобы на курсах марксізму-ленінізму пры Камуніст. акадэміі ў Маскве з 1929 у ВЦСПС, старшыня ЦК прафсаюза работнікаў сувязі СССР, старшыня Скандынаўскай секцыі Выканкома Прафінтэрна. З 1936 на рабоце ў Хабараўску, чл. калегіі краявога суда. Чл. ЦВК СССР у 1922—24 і яго Прэзідыума ў 1924. Чл. ЦВК БССР у 1921—24 і яго Прэзідыума ў 1922—24. Чл. ЦК Кампартыі Польшчы ў 1925—30. У кастр. 1937 незаконна рэпрэсіраваны. Пасмяротна рэабілітаваны 31.3.1956. Яго імем названа вуліца ў Гродне; у Мінску на доме, дзе ён жыў, устаноўлена мемарыяльная дошка.

*А. І. Марозава.*